Звязда

13.12.2018

# У Полацку адкрыецца выстава да юбілею самага старажытнага часопіса Беларусі

**13 снежня ў Навуковай бібліятэцы Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта адкрываецца выстава, прымеркаванай да 200-годдзя самага старажытнага часопіса, выдадзенага на тэрыторыі сучаснай Беларусі – "Полацкага штомесячніка" ("Miesięcznika Połockiego"). Яго ў 1818–1820 гадах выдавалі манахі і выкладчыкі знакамітай Полацкай езуіцкай акадэміі.**


MIESIĘCZNIK
POŁOCKI.
Tom I.
Rok 1818.

*– Часопіс быў заснаваны філосафам і выкладчыкам акадэміі Вінцэнціем Бучынскім з ініцыятывы рэктара акадэміі Раймунда Бжазоўскага. Меў 6 раздзелаў: літаратуры і вольных навук, маральна-філасофскі, фізіка-матэматычны, гістарычны, крытычны, літаратурных навін. На працягу 1818 года выйшла 12 нумароў штомесячніка. Апошнія два нумары з'явіліся ў 1820 годзе напярэдадні закрыцця акадэміі і выгнання езуітаў з краіны,* – расказалі арганізатары.

Адмыслова да гэтай выставы Нацыянальная бібліятэка Беларусі перадала тры асобнікі ўнікальнага выдання. Удзел у адкрыцці выставы і навуковай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю Навуковай бібліятэкі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, прыме намеснік

дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша. *"Для нас вялікі гонар захоўваць кніжную спадчыну Беларусі і рабіць яе даступнай не толькі для нашых чытачоў і наведвальнікаў у Мінску, але праз такія мерапрыемствы прадстаўляць яе ўсім грамадзянам краіны і замежжа",* – паведаміў Алесь Суша.

Выстава будзе працаваць з 13 па 20 снежня ў будынку колішняй Полацкай езуіцкай акадэміі (сёння – корпус Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта). Адкрыццё адбудзецца сёня а 15-й гадзіне па адрасе Полацк, вул. Стралецкая, 4, Корпус А, аўд. 110.